**ЗАКЛЮЧЭННЕ**
**савета па абароне дысертацый Д 02.21.01 па дысертацыі**
**Зяноўка Яўгеніі Сяргееўны**
**"Лінгваакустычныя рэсурсы для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення: фарміраванне, прагматычны патэнцыял, спосабы аптымізацыі"**

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджана вучоная ступень.** Дысертацыя Зяноўка Яўгеніі Сяргееўны "Лінгваакустычныя рэсурсы для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення: фарміраванне, прагматычны патэнцыял, спосабы аптымізацыі" з'яўляецца кваліфікацыйнай навуковай працай і адпавядае спецыяльнасцям 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка і галіне навукі – філалагічныя.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яе значнасці.** Дысертацыя Я. С. Зяноўка з'яўляецца першым комплексным даследаваннем прасадычных характарыстык беларускай літаратурнай мовы ў рамках сістэм сінтэзу маўлення. Праведзены комплексны аналіз інтанацыйных кампанентаў, якія характарызуюць тыпы меладычных партрэтаў сказаў беларускай мовы, абгрунтавана і рэалізавана класіфікацыя міжфразавых і міжсінтагменных паўз. Прыменены міждысцыплінарны падыход на аснове спалучэння метадаў эксперыментальнай фанетыкі і тэхналогій штучнага маўлення. Распрацавана сінтаксічная граматыка для аўтаматычнай экстракцыі тыпаў сінтагм на базе платформы NooJ. Створаны беларускамоўны прасадычны модуль для праграмнага комплексу «IntonTrainer», у аснову якога пакладзена аўтарская лінгваакустычная база даных, што ўключае корпус эталонных фраз з анатацыямі сінтаксічнай структуры, эмацыянальнай афарбоўкі і колькаснага складу сінтагм у сказе, а таксама вынікі комплекснага аналізу інтанацыйных параметраў сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку прысуджана вучоная ступень.** Савет па абароне дысертацый Д 02.21.01 прысуджае Зяноўка Яўгеніі Сяргееўне вучоную ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка **за:**

- стварэнне і ўкараненне комплекснай методыкі аналізу, сістэматызацыі і машыннай апрацоўкі лінгваакустычных рэсурсаў з улікам такіх прасадычных параметраў, як контур мелодыкі, сіла гуку, працягласць паўз, сінтагматычная дэлімітацыя, што значна пашырае метадалагічную базу беларускай прасодыі;
- тэарэтычнае абгрунтаванне і апрабацыю лінгватэхналагічнага падыходу да аналізу маўленчага матэрыялу, скіраванага на ўдакладненне прасадычных параметраў арганізацыі беларускага літаратурнага маўлення; вызначэнне і параметрызацыю сістэмы інтанацыйных канструкцый, дыферэнцыраваных паводле танальнага кірунку ў ядзерным цэнтры, суадносін танальных узроўняў складовых частак, часавай характарыстыкі акцэнтных адзінак сінтагм, магчымасцей мадыфікацыі танальнага контуру сінтагмы ў залежнасці ад эмацыянальнай афарбаванасці выказвання;
- распрацоўку беларускамоўнага прасадычнага модуля для праграмнага комплексу «IntonTrainer», заснаванага на аўтарскай лінгваакустычнай базе даных, у складзе: 1) корпусу эталонных маўленчых узораў (фраз), сістэматызаваных паводле сінтаксічнай структуры, эмацыянальна-стылістычнай афарбоўкі, размеркавання і колькаснага складу сінтагм; 2) вынікаў комплекснага аналізу інтанацыйных параметраў сучаснай беларускай літаратурнай мовы, прадстаўленых у выглядзе колькасных метрык і якасных лінгвістычных характарыстык;
- выяўленне заканамернасцей сінтагматычнага дзялення маўлення, распрацоўку і аўтаматызацыю арыгінальнага аўтарскага алгарытму экстракцыі розных тыпаў сінтагм (пунктуацыйных, лексічных, лексіка-граматычных) на платформе NooJ, эксперыментальнае абгрунтаванне карэктнасці работы алгарытму з выкарыстаннем даных псіхалінгвістычнага даследавання па верыфікацыі прынцыпаў сінтагматычнага дзялення носьбітамі мовы;
- інтэграцыю лінгваакустычных рэсурсаў у беларускамоўныя сістэмы сінтэзу маўлення, што забяспечыла аўтаматычны аналіз тэкставай структуры з дакладным сінтагматычным дзяленнем і вылучэннем акцэнтных адзінак; анатаванне інтанацыйных мадэлей у адпаведнасці з нормамі беларускай літаратурнай мовы; істотнае паляпшэнне якасці сінтэзаванага маўлення за кошт стварэння натуральнай прасадычнай структуры.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў даследавання.**

Атрыманыя вынікі могуць служыць асновай для далейшых даследаванняў на стыку лінгвістыкі, інфармацыйных тэхналогій і штучнага інтэлекту, будуць запатрабаваны пры распрацоўцы тэарэтычных і прыкладных праблем беларускай прасодыі: для супастаўлення інтанацыйных параметраў беларускай і іншых моў, а таксама ў камп'ютарным мадэляванні прасадычных сістэм, корпуснай лінгвістыцы, для стварэння сістэм аўтаматычнай апрацоўкі натуральнай мовы, маўленчых тэхналогій, галасавых асістэнтаў. Тэарэтычныя матэрыялы могуць прымяняцца ў вучэбна-метадычнай рабоце пры выкладанні вучэбных дысцыплін па камп'ютарнай і корпуснай лінгвістыцы, сучаснай беларускай літаратурнай мове, беларускай дыялекталогіі, тэорыі мовы.

Старшыня савета
па абароне дысертацый — В. Д.Старычонак
Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — А. В.Чуханова
07.05.2025